видение режиссеров, но и процессы, происходящие в социуме. Взгляды на окружающий мир, образ жизни, поведение и иные факторы общественного бытия неизменно влияют на авторскую интерпретацию.


1. *Волкова, П. С.* Реинтерпретация художественного текста (на материале искусства XX века) : монография / П. С. Волкова. – Краснодар : Хорс, 2008. – 200 с.

2. *Красовская, В. М.* История русского балета : учеб. пособие / В. М. Красовская. – Л. : Искусство, 1978. – 231 с.

3. *Скворцова, И. А.* Балет П. И. Чайковского «Щелкунчик»: опыт характеристики / И. А. Скворцова. – М. : Моск. консерватория, 2011. – 68 с.


УДК 069.51:2-523.45(476.5)


***Т. А. Джумантаева,***

*кандыдат культуралогіі, дацэнт,*

*дактарант установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*


## РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ СПАДЧЫНЫ ПРАПАДОБНАЙ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ


**Анатацыя.** Прадстаўлены музеялагічныя разважанні над праблемай рэпрэзентацыі спадчыны прападобнай Еўфрасінні Полацкай напярэдадні падрыхтоўкі да святкавання 900-годдзя старажытнага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Згаданы юбілей вяртае нас да неабходнасці перагляду вядомых гістарычных і культуралагічных фактаў, звязаных з дзейнасцю Еўфрасінні Полацкай. З улікам апошніх навуковых даследаванняў зроблены агляд аб'ектаў спадчыны. Акрамя таго, у святле музеефікацыі гістарычнай тэрыторыі Полацка дарэчы і своечасова разглядаць перспектыўныя магчымасці рэканструкцыі хрысціянскай традыцыі праз рэпрэзентацыю спадчыны прападобнай Еўфрасінні.



**Ключавыя словы:** прападобная Еўфрасіння, рэпрэзентацыя, Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, жыційная (агеаграфічная) літаратура, полацкая школа дойлідства, узвізальны крыж Лазара Богшы, абраз Маці Божай Адзігітрыі Эфескай, ансамбль фрэсак Спаса-Праабражэнскай царквы.

***T. Jumantayeva,***
*PhD in Culturology, Associate Professor, Doctoral student of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## REPRESENTATION OF THE HERITAGE OF ST. EUPHROSYNE OF POLOTSK

**Abstract.** The article is written in the format of a scientific essay, which presents the author's museological reflections on the problem of representing the heritage of St. Euphrosyne of Polotsk, on the eve of preparations for the celebration of the 900th anniversary of the ancient Saviour-Eufrosyne Convent. The mentioned anniversary brings us back to the need to review the known historical and cultural facts related to the activities of Euphrosyne of Polotsk. Taking into account the latest scientific research, an overview of heritage objects is made. In addition, in light of the museification of the historical territory of Polotsk and its transformation into a city-museum, it is appropriate and timely to consider the promising possibilities of the reconstruction of the Christian tradition through the representation of the legacy of St. Euphrosyne.
**Keywords**: Saint Euphrosyne, representation, Savior-Euphrosyne Convent, hagiographic (ageographic) literature, Polotsk school of architecture, erection cross of Lazar Bogsha, icon of Our Lady Hodegetria of Ephesus, ensemble of frescoes of the Transfiguration Church of our Savior.

900-годдзе Полацкага Спаскага манастыра будзе святкавацца ў 2025 г., таму ўжо сёння важнае значэнне надаецца праблематыцы рэпрэзентацыі духоўнай і культурнай спадчыны эпохі – унікальнай асобы ў гісторыі Беларусі – прападобнай Еўфрасінні Полацкай. Руская Праваслаўная царква называе яе заступніцай жаночага манаства, ігуменняй, якая стварыла ў Полацку адзін з першых усходнееўрапейскіх манастыроў – Спаскі, які з сярэдзіны XIX ст. называецца Спаса-Еўфрасіннеўскім [10, с. 103].

Напярэдадні юбілею на тэрыторыі манастыра будзе ўзведзены новы корпус манастырскай трапезнай і завершана рэстаўрацыя Спаса-Праабражэнскай царквы, якая па замове прападобнай Еўфрасінні была пабудавана дойлідам Іаанам (магчыма, каля 1137 г.). Пры яе жыцці храм быў распісаны фрэскамі, якія захаваліся да гэтага часу ў поўным аб'ёме. «Дзякуючы найноўшым адкрыццям, зробленым падчас раскрыцця фрэскавага роспісу, ужо не даводзіцца сумнявацца ў актыўным удзеле ігуменні ў складанні іканаграфічнай праграмы ўсёй дэкарацыі Спаскай царквы, выкананай каля 1161 г.» [11, с. 366].

Вядома, у горадзе адкрываюцца новыя музейныя экспазіцыі, звязаныя з гісторыяй манастыра і падзвіжніцкай дзейнасцю Святой Еўфрасінні Полацкай. У філіяле Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка – Мастацкай галерэі – з 2013 г. працуе экспазіцыя «Сценапіс XII–XIX стагоддзяў Спаскага храма ў Полацку» [3, с. 125]. Яна расказвае пра ўнікальную полацкую школу архітэктуры і манументальны жывапіс Спаса-Праабражэнскага сабора XII–XIX стст. Работы па раскрыцці фрэсак ажыццяўляліся адначасова з адслаеннем і пераносам на новую пастаянную аснову позняга алейнага жывапісу XVIII–XIX стст. Фрэскі засталіся ў Спаскім саборы, а адслоены жывапіс перанесены ў галерэю, дзякуючы чаму сёння можна ўбачыць тры варыянты роспісу: у храме – фрэскі XII ст., а ў галерэі – жывапіс 1837 і 1885 гг. Акрамя таго, экспазіцыя ўключае археалагічныя знаходкі XII ст., копіі фрэсак і іх графічныя выявы, макеты полацкіх помнікаў архітэктуры XII ст., прадметы літургічнага ўжытку і асабістай набожнасці, а таксама лічбавыя праекцыі і фільмы, якія фіксавалі працэсы адкрыцця фрэсак, адслаення жывапісу і перанясення яго на пастаянную аснову. Спецыфіка дадзенай экспазіцыі як сістэмы ў тым, што ўсе яе элементы, у тым ліку інфармацыйнае забеспячэнне, складаюць адзінае цэлае і не парушаюць гармоніі і сутнаснай асновы. Яны непасрэдна звязаныя з аб’ектамі духоўнай і матэрыяльнай спадчыны прападобнай Еўфрасінні Полацкай.

Мы неаднаразова праз дасье ЮНЕСКА і асобныя артыкулы [2] звярталіся да тэмы матэрыяльнага ўвасаблення духоўнай спадчыны прападобнай Еўфрасінні Полацкай, дзе акцэнтавалі ўвагу на асобе Святой і яе непасрэдным удзеле або ўплыве на стварэнне аб’ектаў матэрыяльнай і духоўнай культуры: Жыцця, Полацкага Евангелля і іншых рукапісных кніг, Крыжа Лазара Богшы, Спаскай царквы з ансамблем фрэскавага роспісу, іконы Эфескай Маці Божай, актавых пячатак, пеўчага цыкла (стыхіры). Названыя аб’екты ў арыгіналах, факсіміле ці копіях прысутнічаюць у экспазіцыі.

Асноўным метадам, які пры стварэнні экспазіцыі прызваны рэканструяваць рэчаіснасць, з’яўляецца метад музейнай рэпрэзентацыі. У дысертацыі С. В. Гаўрылава дала вызначэнне: «Музейная рэпрэзентацыя – гэта працэс вобразнай рэканструкцыі

аб’ектыўнай рэчаіснасці праз стварэнне яе мадэлі на аснове актуалізацыі акумуляванай музейнымі прадметамі інфармацыі і яе далейшай трансляцыі ў музейнай камунікацыі» [1, с. 15]. Яна ўяўляе шматузроўневы працэс, дзе на першым узроўні акумулююцца інфармацыя, сэнсы і значэнні, якімі валодаюць музейныя прадметы. З цягам часу з’яўляюцца новыя крыніцы (напрыклад, археалагічныя ці пісьмовыя) і адкрываюцца новыя сэнсы, што патрабуе перагляду экспазіцыі як мадэлі.

Асноўнай крыніцай, якой мы карыстаемся, каб уявіць маштаб і значнасць дзейнасці Святой – гэта «Жыціе прападобнай Еўфрасінні Полацкай», помнік гістарычнай і агіяграфічнай літаратуры, дайшоўшы да нас у некалькіх дзясятках спісаў XVI–XVIII стст. і розных рэдакцыях. Тым не менш, у 2020 г. у навуковай літаратуры з’явіўся яшчэ адзін раней невядомы тэкст кароткай праложнай рэдакцыі Жыція. Ён быў знойдзены ў рукапісным Простым (несцішным) пралогу, які захоўваецца ў Львоўскім гістарычным музеі (№ 108) [4]. Гэты рукапіс можа стаць каштоўнай крыніцай для вывучэння рэлігійных і сацыякультурных аспектаў жыцця сярэдневяковага Полацка. Факт знаходкі тэксту падкрэслівае актуальнасць Жыція і надзею на тое, што гэтая крыніца працягвае натхняць і ўзвышаць душы вернікаў і шукальнікаў ісціны.

Знаходка ў 2015 г. чацвёртай актавай пячаткі Еўфрасінні Полацкай падчас археалагічных даследаванняў Спаскай царквы падштурхнула гісторыка і археолага С. В. Тарасава зрабіць спробу ажывіць час, у якім жыла прападобная Еўфрасіння, прадставіўшы яго ў сваёй кнізе «…чалавечым, каляровым і прадметным» [13, с. 3].

Падчас раскопак на Вялікім пасадзе (гандлёва-рамесніцкі цэнтр Полацка) яшчэ ў 1988 г. С. В. Тарасаў знайшоў сядзібу полацкага ювеліра XII ст., якая займала 1500 м$^2$ (дарэчы, у Полацку ў XII ст. пражывала больш за 14 тыс. чалавек, а яго плошча дасягала 80 га [6, с. 231]). Па меркаванні С. В. Тарасава, сядзіба з ювелірнай майстэрняй магла належаць Лазару Богшу, які вырабіў па замове прападобнай Еўфрасінні легендарны ўзвізальны крыж-рэлікварый для Спаскай царквы [12, с. 289–307]. Але гэтая версія можа быць перагледжана, таму што падчас археалагічнага сезона 2023 г. на Ніжнім замку побач з Вялікім пасадам археолагі знайшлі цэлы гарадскі квар-

тал, дзе жылі і працавалі ювеліры. Калі ўлічваць, што развіццё ювелірнага рамяства звязана з раннім прыняццем хрысціянства, то паўстае пытанне аб часе, калі полацкія крывічы былі ахрышчаны [7, с. 16].

XI–XIII стст. – гэта час існавання незалежнага Полацкага княства і час мірнага пашырэння хрысціянскага вучэння, якое суіснавала побач з паганствам некалькі стагоддзяў. Пэўнай катэгорыяй прадметаў асабістай набожнасці, якія пацвярджаюць гэтую тэзу, з’яўляюцца амулеты-змеевікі ў выглядзе манетападобных падвесак з выявай хрысціянскай сімволікі на пярэднім баку, і «змяінага гнязда» – на адваротным. Іх выявы ёсць на фрэсках Спаскай царквы [13, с. 182].

Росквіт Полацкага княства прыпадае на час праўлення легендарнага князя Усяслава Брачыславіча (1044–1101), дзеда Еўфрасінні Полацкай. Ён пабудаваў у сярэдзіне XI ст. Сафійскі сабор, дзе першыя 8 гадоў манаскага служэння юная Еўфрасіння перакладала і перапісвала кнігі.

Адным з найбольш старажытных помнікаў полацкага дойлідства пасля Сафійскага сабора стаў храм у мястэчку Сяльцо. Туды ў 1125 г. і адправілася Еўфрасіння будаваць свой манастыр. Вядомыя нам крыніцы не называюць дакладную дату стварэння манастыра, але ў Жыціі згадваюцца факты благаслаўлення Еўфрасінні біскупам Ільёй і ўдзелу ў гэтым праекце князя Барыса Усяславіча (абодва памерлі ў 1128 г.). Таму дата – 1125 г. – цалкам прымальная.

Знаходжанне ў гэты перыяд у Канстанцінопалі высланых полацкіх князёў магло быць карысным для наладжвання больш шчыльных адносін Полацка з Візантыяй. Адтуль Еўфрасіння змагла атрымаць розныя святыні і рэліквіі для Крыжа Лазара Богшы, а таксама спіс з цудатворнай іконы Маці Божай Адзігітрыі Эфескай [8]. Ікона была пастаўлена ў царкве Багародзічнага мужчынскага манастыра, пабудаванага Еўфрасінняй, і адразу стала адной з галоўных святынь Полацка. Сёння ў Мастацкай галерэі экспануецца копія, створаная ў манастырскай майстэрні.

Такой жа важнай святыняй для хрысціян стаў Крыж Лазара Богшы. Рэліквіі, якія прыбылі з пасольствам з Канстанцінопаля, былі ўкладзены ў крыж, які Еўфрасіння замовіла як узвізальны для Спаскага храма полацкаму ювеліру Лазару

Богшу. На жаль, у 1941 г. Крыж быў страчаны. У 1997 г. пасля доўгіх навуковых вывучэнняў і адраджэння страчанай тэхнікі перагародчатай эмалі, у якой былі выкананы на Крыжы мініяцюры святых, у Спаскі манастыр быў урачыста дастаўлены адноўлены Крыж, выраблены брэсцкім ювелірам М. П. Кузьмічом. У 2007 г. была адноўлена і сярэбраная рака, вырабленая па эскізах, зробленых з фотаздымкаў 1910 г. [10].

Сцены Спаса-Праабражэнскай царквы з'яўляюцца найкаштоўнейшым помнікам эпіграфікі XII–XVII стст. (захаваліся 4 тыс. графіці) і палеаграфіі. Унікальны па сваёй паўнаце і аб'ёме корпус графіці сабора дазваляе ўявіць узровень развіцця пісьменства і мовы на тэрыторыі Полацкага княства [5].

Удалыя археалагічныя сезоны, даследчая і пошукавая работа, новыя навуковыя інтэрпрэтацыі вядомых крыніц (улічваючы інтэрпрэтацыі аб'ектаў спадчыны Прападобнай, зробленыя ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры падчас выдання Даведніка ў 2023 г. [9]), а таксама сучасныя музейныя тэхналогіі дазваляюць ствараць мадэлі мінулых гістарычных эпох, выкарыстоўваючы музеефікаваныя аб'екты, аўтэнтычныя музейныя прадметы, копіі і рэканструкцыі.

Музейная рэпрэзентацыя спадчыны прападобнай Еўфрасінні Полацкай з'яўляецца складанай праблемай. Яе асоба і яе статус патрабуюць асаблівага падыходу да прадстаўлення ў музейнай прасторы. Адной з ключавых задач з'яўляецца балансаванне паміж рэлігійным шанаваннем і музейным дакументаваннем.


1. *Гаўрылава, С. В.* Рэпрэзентацыя краязнаўчымі музеямі Рэспублікі Беларусь сацыякультурнага развіцця рэгіёнаў : аўтарэф. дыс. … канд. культуралогіі : 24.00.03 / С. В. Гаўрылава ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2023. – 26 с.

2. *Джумантаева, Т. А.* Материальное воплощение духовного наследия святой Ефросинии Полоцкой / Т. А. Джумантаева // На пути к справедливому обществу: женщины в общественной жизни, науке, культуре (1919–2019) : сб. науч. ст. по итогам Междунар. науч.-практ. семинара (Новосибирск, 15–16 окт. 2019 г.) / отв. ред. Е. А. Ерохина, О. Н. Шелегина. – Новосибирск, 2019. – С. 74–85.

3. *Джумантаева, Т. А.* Полацк музейны =Полоцк музейный = Museal Polotsk: фотоальбом / Т. А. Джумантаева. – Мінск : Беларусь, 2020. – 333 с.

4. *Журина, Ю. С.* Житие преподобной Евфросинии Полоцкой в рукописном прологе XVII в. из Львовского исторического музея / Ю. С. Журина // Slavistica Vilnensis. – 2020. – Vol. 65 (2). – P. 131–135.

5. *Калечиц, И. Л.* Корпус граффити Полоцкой Спасо-Преображенской церкви: северная келья / И. Л. Калечиц. – М. : Квадрига, 2023. – 204 с.
6. *Кирпичников, А. Н.* Полоцк по письменным и археологическим источникам: вариант нового осмысления / А. Н. Кирпичников // Древняя Русь: во времени, в личностях, в идеях. – 2016. – Вып. 5. – С. 224–233.
7. *Петров, А. Н.* Атрибуция актовых печатей первого полоцкого князя Рогволода / А. Н. Петров, Д. В. Гулецкий // Русь, Литва, Орда в памятниках нумизматики и сфрагистики. – Вып. 4. – М., 2017. – С. 11–24.
8. *Петров, А. Н.* Приобретение Ефросиньей Полоцкой Эфесской иконы в Константинополе в свете находок греческих печатей под г. Сенно: к постановке вопроса полоцко-византийской церковной дипломатии второй половины XII в. / А. Н. Петров, Д. В. Гулецкий // Белорусский исторический обзор. – М., 2020. – № 1(3). – С. 71–78.
9. Полоцкий Спасо-Евфросиниевский женский монастырь с древности до наших дней. Путеводитель. – Минск : Спасо-Евфросиниевский женский монастырь в г. Полоцке, 2023. – 78 с.
10. Полоцкое Радование: Свято-Евфросиниевские Торжества 1910 года / ред. А. Г. Борисова-Горюнова. – Минск : Спасо-Евфросиниевский монастырь в г. Полоцке, 2010. – 440 с. : ил.
11. *Сарабьянов, В. Д.* Спасская церковь Евфросиниевского монастыря в Полоцке / В. Д. Сарабьянов. – 3-е изд. – Белосток : Спасо-Евфросиниевский женский монастырь в г. Полоцке, 2016. – 516 с.
12. *Тарасаў, С. В.* Афрасіння Полацкая і археалогія / С. В. Тарасаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы VIII Міжнар. навук.-практ. канф. (Полацк, 1–2 лістап. 2022 г.) / уклад. Т. У. Явіч. – Полацк : Полацкае кніжнае выдавецтва, 2022. – 360 с.
13. *Тарасаў, С. В.* Еўфрасіння – Офрасіння – Афрасіння Полацкая. Яе час, яе крыж / С. В. Тарасаў. – Мінск : Цымбераў Р. М., 2021. – 368 с.

УДК 37.026:[780.64+780.63]

***Е. Н. Довжик,***
*заслуженный артист Республики Беларусь, доцент кафедры духовой музыки учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», г. Минск, Беларусь*

## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ОСНОВНЫХ ДИДАКТИЧЕСКИХ ПРИНЦИПОВ ПРИ ИНДИВИДУАЛЬНОМ ОБУЧЕНИИ ИГРЕ НА ДУХОВЫХ И УДАРНЫХ ИНСТРУМЕНТАХ

**Аннотация.** Рассматриваются и кратко анализируются основные дидактические принципы обучения в музыкальной сфере, касающиеся процесса овладения игрой на духовых и ударных музыкальных инстру-